ность за повышенные планы по прибыли. В переведённых на новые условия хозяйствования предприятиях лучше решались социальные проблемы, были более чётко организованы перевозки и оказалась ниже текучесть кадров. Автомобильные хозяйства, переведённые на новые условия работы, стали материально поощряться за сокращение простоя автомобилей под погрузкой и разгрузкой [3, л. 4]. В июне 1967 г. так работало 63% хозяйств Минавтотранса.

В ходе реформы, тем не менее, с ведомств требовали принятия действенных мер по ритмичному вывозу грузов с железнодорожных станций, по улучшению эксплуатации технических средств, использованию опыта передовых коллективов по поиску резервов. Министерству автотранспорта, министерствам и ведомствам, которые имели грузовой автотранспорт, обкомам КПБ, облисполкомам и Минскому горисполкому было поручено принять необходимые меры по укрупнению автохозяйств, повышению эффективного использования машин, всемерного удовлетворения потребностей хозяйства и населения в автомобильных перевозках, сокращению порожних пробегов грузовых автомобилей.

Широкое использование новых экономических методов управления транспортом пришлось на 2-ю пол. 1960-х гг., когда были разработаны и осуществлены мероприятия по внедрению элементов научной организации труда, повышению использования основных производственных фондов и оборотных средств, росту производительности труда, соблюдению режима экономии и увеличению рентабельности. По постановлению СМ СССР от 7 июля 1967 г. речникам определили отчисления в фонды развития производства и поощрения. Перевод пароходств, районных управлений, портов и пристаней на новую систему осуществлялся согласно конкретного решения республиканского кабинета министров, который получил право изменять по своему усмотрению размер амортизационных отчислений, направляемых в фонд развития производства по предприятиям речного транспорта, утверждал нормативы отчислений в фонд материального поощрения. В ходе реформы Верхне-Днепровское речное пароходство и пристани речников в БССР перевели на новую систему с 1 июля 1968 г.

На дальнейшее проведение мероприятий реформы предприятия направили на XXVII съезде КПБ, так как был очевиден результат. Прибыль по Белорусской ЖД, речному и автомобильному транспорту только за 1970 г. выросла на 11%, увеличилась производительность труда, снизилась себестоимость перевозок, перевыполнялся план накоплений. Но о сложностях с проведением реформы засвидетельствовало профильное решение ЦК КПБ и СМ БССР от 24 апреля 1973 г. по совершенствованию управления. для повышения заинтересованности в росте производительности труда вновь усиливали зависимость зарплаты транспортников от результатов их работы [4, л. 2]. То есть для стимулирования труда имевшихся по факту фондов поощрения оказалось недостаточно.

**Заключение.** Специфика реформы 1965 г. на транспорте проявилась в рациональном использовании подвижного состава, во взаимоотношениях крупных предприятий с низовыми подразделениями. Но был проблемным показатель грузооборота, так как в целях его достижения не всегда оправданно повышали дальность перевозок.


1. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Оп. 2А. Д. 9.
2. Юшкевич, Е.П. Время, скорость, грузы / Е.П. Юшкевич // Советская Белоруссия. – 1969. – 20 марта. – С. 2.
3. НАРБ. – Ф. 690. Оп. 6. Д. 91.
4. Государственный архив Могилевской области. – Ф. 2933. Оп. 1. Д. 709.


## БРЭСЦКІ МІР І ПРАБЛЕМЫ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ


*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Першая сусветная вайна, перамовы аб міры з Германіяй, Брэсцкі мір – гэты падзеі, якія аказалі вялізарны уплыў на развіццё беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, на лес Беларусі, яе дзяржаўнасць і будучыню. Германія і Савецкая Расія у 1918 годзе вялі перамовы аб заключэнні сепаратнага міру без уліку тэрытарыяльных інтарэсаў беларускага этнасу і без удзелу прадстаўнікоў ад Беларусі.



Репозиторий ВГУ

Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз дзейнасці прадстаўнікоў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, членаў Беларускай сацыялістычнай грамады па вырашэнню пытання стварэння дзяржаўнасці на Беларусі ў студзені – красавіку 1918 годза і захавання цэласнасці яе этнічнай тэрыторыі.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыяла былі выкарыстаны дакументы з фондаў НАРБ, артыкулы дзеячоў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, апублікаваныя ў 1993 г. у часопісу "Беларускі гістарычны часопіс",.даследаванні Я. Юхо, І.Ігнаценка. Рэалізаваны лагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмна-комплекснага аналізу навуковай літаратуры і крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першая сусветная вайна пачалася 1 жніўня 1914 г. як вынік супярэчнасцей паміж буйнымі імперыялістычнымі дзяржавамі. Ужо з лета 1915 г. баявыя дзеянні вяліся на тэрыторыі Беларусі. У кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся на лініі Дзвінск-Паставы-Баранавічы-Пінск. Каля паловы тэрыторыі Беларусі апынулася пад нямецкай акупацыяй, другая частка засталася ў складзе Расійскай імперыі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавіцкі ўрад імкнуўся заключыць перамір'е с Германіяй, а потым і сепаратны мір. Выкарыстоўваючы абвешчанае бальшавікамі права нацый на самавызначэнне, прадстаўнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху склікалі у снежні 1917 гю у Мінску 1-ы Усебеларускі з'езд, які павінен быў вырашыць пытвнне аб уладзе на Беларусі. Аднак на 1-ым Усебеларускім з’езде ўздымалася яшчэ адно вельмі значнае пытанне для лёсу Беларусі. Гэта пытанне аб удзеле беларускіх прадстаўнікоў у мірных перагаворах, якія непасрэдна датыкаліся тэрытарыяльных інтарэсаў Беларусі. У выступленні Я.Варонкі (1.-С.52) ад імя БСГ і ў рэзалюцыі, якую быў павінен прыняць з’езд, гаварылася аб тым, што “Выканаўчым органам Часовай Краёвай Улады дэлегуюцца свае прадстаўнікі ... для ўдзелу ў адбываючыхся перагаворах аб міры.”(2.-С.57) Згодна з гэтым Выканкам Рады 1 Усебеларускага з’езда распрацаваў Дэкларацыю для беларускай мірнай дэлегацыі, якая прадугледжвала... ўваход адзінай і непадзельнай у этнаграфічных межах Беларусі як раўнапраўнай аўтаномнай часткі ў Расійскую Дэмакратычную Федэратыўную Рэеспубліку; нацыянальна-персанальную аўтаномію для нацыянальных меншасцей Беларусі; уз’яднанне акупіраваных частак з беларускім насельніцтвам з аўтаномнай Беларуссю; ачышчэнне акупіраваных частак Беларусі ад войск, якія яе займаюць; вяртанне бежанцаў на радзіму за кошт міжнароднага фонда і інш. (3). На думку беларускіх дзеячоў у аснову ўсеагульнага дэмакратычнага міру павінны быць пакладзены наступныя палажэнні: мір без анексій і кантрыбуцый на аснове самавызначэння народаў; вырашэнне пытання аб лёсе акупіраваных тэрыторый ідзе шляхам свабоднага галасавання насельніцтва пасля вяртання на акупіраваныя часткі бежанцаў і вываду адтуль войск, якой бы краіне яны не належалі, знішчэнне тайнай дыпламатыі і інш (3).

26 студзеня 1918 г. дэлегацыя Выканкама Рады 1 Усебеларускага з’езда перайшла лінію фронта і накіравалася ў Баранавічы, а потым у Брэст-Літоўск, дзе ішлі перагаворы паміж Савецкай Расіяй і Германіяй аб заключэнні сепаратнага міра. Як паведамляе прадстаўнік беларускай мірнай дэлегацыі С.Рак-Міхайлоўскі /член БСГ/, яны прадугледжвалі ў Брэсце магчымасць розных варыянтаў. Па-першае, калі беларускую дэлегацыю не прызнаюць у якасці самастойнага боку ў перагаворах ні Л.Троцкі, ні Аўстра-Германія, яна павінна дамагацца магчымасці заявіць сваю дэкларацыю і пратэст. Па-другое, калі беларускую дэлегацыю не прызнае Л.Троцкі і не ўключыць у склад агульнарасійскай дэлегацыі, але празнае процілеглы бок, ёй неабходна зрабіць заяву, што прадстаўнік рускай рэвалюцыйнай улады піхае беларусаў “у абдымкі Германцаў“, але яны не пойдуць па гэтаму шляху, не жадаючы вырашаць пытанне аб міру сепаратна і застаюцца ў Брэсце, “як вушы і вочы беларускай Рады”, зберагаючы права дарадчага голасу ў перагаворах. Па-трэцяе, калі беларускую дэлегацыю прызнаюць і ўключаць у склад агульнарасійскай дэлегацыі, то яна ў такім выпадку павінна дзейнічаць згодна з Дэкларацыяй (4).

На самой жа справе адбылося так, што беларускую дэлегацыю прадстаўнікі Савецкай Расіі не прызналі, і яна была вымушана ўвайсці ў склад украінскай дэлегацыі, але ў гэты час бакі, якія вялі перагаворы, ужо рыхтаваліся падпісаць мірнае пагадненне. Такім чынам, лёс Беларусі вырашаўся без удзелу саміх беларусаў.

Тым часам пытанне аб далейшым лёсе Беларусі абмяркоўвалася і на акупіраванай немцамі тэрыторыі. 25-27 студзеня ў Вільні адбылася беларуская канферэнцыя, актыўны ўдзел у якой пры-



Репозиторий ВГУ

няла Віленская група БСГ на чале з А.Луцкевічам. Згодна са сваімі поглядамі на дапамогу Германіі ў вырашэнні пытання аб дзяржаўнай незалежнасці Віленскія беларускія дзеячы, як паведамляе А. Луцкевіч: “У палітычнай рэзалюцыі... паспрабавалі яшчэ раз выставіць пытанне аб дуалістычнай або траістай дзяржаве: беларуска-літоўска-латышскай, як адзіна рацыянальнай з гаспадарчага пункту гледжання і дастаткова значнай, каб уяўляць рэальную баявую моц” (5.-С.140). Гэткая рэзалюцыя была паслана германскаму канцлеру, але нямецкі ўрад на яе не адказаў.

Канферэнцыя абрала Віленскую Беларускую Раду, якая адразу, як бачна з рэзалюцыі, прыняла востры незалежніцкі напрамак. 18 лютага, калі Савет камісараў Заходняй вобласці пакінуў Мінск, у выніку наступлення нямецкіх войск, Віленская Беларуская Рада выдала пастанову гэткага зместу: “Палякі выказваюць захопныя тэндэнцыі на Беларусі, рускія войскі ня далі магчымасці з’арганізавацца беларускай арміі і самі кінулі Беларусь безабароннай; Беларусь мае ў гісторыі доказы магчымасці незалежнага палітычнага існавання; бальшавіцкі ўрад вёў гвалтоўную палітыку над беларускім народам, аб чым сведчыць разгон Усебеларускага кангрэсу ў Мінску. Прымаючы ўсё гэта на ўвагу, Віленская Беларуская Рада абвяшчае сувязь паміж Расіяй і Беларуссю парванай.

Рада звяртаецца да ўсіх заходніх дзяржаў, асабліва да Няметчыны, якая мае найбольш эканамічных інтарэсаў, супольных з Літоўска-Беларускі краем, каб яны дапамаглі у справе адбудовы дзяржаўнай незалежнасці колішняга Літоўска-беларускага гаспадарства, нягледзячы на цяперашні раздзел яго мяжою фронту” (6).

Тым часам пасля зрыву перагавораў у лютым пачынаецца германскае наступленне на ўсход і у Мінску кіраўніцтва беларускіх сацыялістычных партый вырашыла, што надышоў час рашучых дзеянняў. Выканаўчы камітэт Рады з’езда энергічна ўзяўся за палітычную і дзяржаўна-адміністратыўную працу і 21 лютага 1918 г. выдаў першую Устаўную грамату да народаў Беларусі. У ёй канстатавалася пагроза заняцця краю немцамі і неабходнасць узяць свой лёс ва ўласныя рукі. “Беларускі народ павінен здзейсніць свае правы на поўнае самавызначэнне, нацыянальныя меншасці на нацыянальна-персанальную аўтаномію”,- зазначалася ў Грамаце. У ёй таксама было аб’яўлена, што “Выканаўчы камітэт Рады 1-га Усебеларускага з’езда, папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцей, ажыццяўляючы задачу, ускладзеную на яго з’ездам, аб’яўляе сябе часовай уладай Беларусі”, да склікання Усебеларускага ўстаноўчага сходу (7.-С.65).

У заключэнні паведамлялася, што часовую народную ўладу ў краі, якая ставіць задачу абароны і ўмацавання заваёў рэвалюцыі, будзе ажыццяўляць Народны Сакратарыят Беларусі (7.-С.65). У склад Народнага Сакратарыята - першага беларускага ўрада - увайшлі Я.Я.Варонка ( страшыня), П.А.Бадунова, Т.Т.Грыб, А.К.Карач, П.А.Крачэўскі - члены БСГ, І.Н. Макрэеў, Е.Е.Бялевіч, І.Н.Серада, В.Рэдзька, Г.І. Бялкінд, П.Б.Злобін - эсеры, М.Л.Гутман - ЯСРП, Л.І.Заяц - народны сацыяліст , К.Б.Езавітаў (8.-С.107).

Але Беларускі ўрад мог свабодна дзейнічаць у Мінску толькі няцэлы тыдзень. З 25 лютага на Беларусі афіцыйна ўсталявалася нямецкая ўлада . Аднак Народны Сакратарыят паспеў стварыць беларускую камендатуру горада і тым самым уратаваў насельніцтва ад стыхіі анархіі. Як лічыць Я.Юхо:” Выканаўчы камітэт Рады і Народны Сакратарыят Беларусі ... былі законнымі органамі ўлады на Беларусі." (7.-С.65).

Між тым 3 сакавіка 1918 г. Расіяй быў падпісаны Брэсцкі мірны дагавор з Германіяй і іншымі дзяржавамі, па якім значную тэрыторыю Беларусі ўрад РСФСР, а фактычна VII з‘езд РКП/б/, перадаваў Германіі. У гэты час ужо нельга было гаварыць аб аўтаноміі ў складзе Расіі, бо тэрыторыя Беларусі юрыдычна і фактычна разрывалася на тры часткі. Заходняя - Гродзенская губерня і частка Віленскай з горадам Вільняй - уключалася ў склад Германіі. Насельніцтва яе станавілася грамадзянамі Германіі. Тэрыторыя ўжо лічылася не беларускай і не расійскай, а нямецкай і атрымлівала назву Новая ўсходняя Прусія (7.-С.65).

Цэнтральная частка - Мінская губерня, частка Віцебскай і Магілёўскай - лічылася часова акупіраванай тэрыторыяй. У артыкуле 3 Брэсцкага дагавора гаварылася: “Для означенных областей из их прежней принадлежности к России не будет вытекать никаких обязательств по отношению к России.

... Россия отказывается от всякого вмешательства во внутренние дела этих областей. Германия и Австро-Венгрия намериваются определить будущую судьбу этих областей по снесении с их населением” (7.-С.65).

Толькі самыя ўсходнія раёны Беларусі заставаліся ў складзе РСФСР.

Такім чынам, дакументы сведчаць, што менавіта Савецкі ўрад, падпісваючы гэты дагавор, не лічыўся з інтарэсамі Беларусі, пакідаў яе безабароннай.

У гэты час у Мінск прыбыла дэлегацыя віленскіх беларускіх дзеячоў, прадстаўнікоў Віленскай Беларускай Рады і Віленскай арганізацыі БСГ, у складзе А. і І. Луцкевічаў, Д.Сямашкі, Я.Станкевіча і В.Туркевіча (8.-С.108). Пасля некалькіх нарад паміж віленскай дэлегацыяй, Народным Сакратарыятам і дзеячамі Рады рэспублікі былі выпрацаваны асноўныя тэзісы аб адносінах да Брэсцкага трактату і аб нацыянальнай дзяржаўнасці на Беларусі. Яны складаліся з наступных пунктаў: "1/ падзел Беларусі па Брэсцкаму трактату не можа быць цярпім беларусамі; 2/ калі савецкі ўрад не можа ануляваць свайго подпісу, супраць падзелу павінны пратэставаць самі беларусы; 3/ неабходна для гэтага абвясціць незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, т.я. толькі тады яна можа патрабаваць вяртання Заходняй Беларусі, калі выступіць у якасці суверэнай дзяржавы; 4/ парываючы дзяржаўную сувязь з Савецкай Расіяй, неабходна аперціся на Германію і ісці з ёй поплеч, замацаваўшы саюз з ёй у той ці іншай форме - у залежнасці ад абставін" (5.-С.141). Аўтарам гэтых тэзісаў быў А.Луцкевіч, але, як ён зазначае: "... дзеячы Рады і Народнага Сакратарыяту ... ня толькі не супярэчылі мне, а наадварот, заяўлялі, што і яны - да майго прыезду - ужо абгаворвалі гэтыя пытанні і прыйшлі да тых жа вывадаў" (5.-С.141).

9 сакавіка 1918 г. адбылося першае пасяджэнне Выканкама 1 Усебеларускага з'езда. Да гэтага ў яго састаў было ўведзена 9 членаў ад правінцыяльных беларускіх рад, 10 - ад земства і гарадскога самакіравання і 15 - ад нацыянальных меншасцей (9). На гэтым пасяджэнні была прынята другая Устаўная грамата да народаў Беларусі, у якой адзначалася, што Усебеларускі з'езд зацвердзіў на землях Беларусі рэспубліканскі лад. Далей у Грамаце было аб'яўлена, што

1. Беларусь у рубяжах рассялення і лічэбнай перавагі Беларускага народа абвяшчаецца Народнай Рэспублікай.

2. Асноўныя законы БНР зацвердзіць Устаноўчы сойм Беларусі, скліканы на асновах агульнага і роўнага, простага, патаемнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на пол, народнасць і рэлігію.

3. Да часу, пакуль збярэцца Устаноучы сойм Беларусі, заканадаучая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускага з'езда, папоўненай прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей Беларусі." (2.-С.71).

Важнае канстытуцыйнае значэнне мела абвяшчэнне ў другой Устаноўчай Грамаце дэмакратычных свабод: вольнасці слова, друку, сходаў, забастовак, недатыкальнасці асобы і памяшканняў і г.д. (2.-С.71).

Большасць дзеячоў БНР, абвяшчаючы ў лютым 1918 г. Беларускую Народную Рэспубліку, мела намер бачыць яе аўтаномнай у складзе Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Аднак пасля падпісання Брэсцкага міру дзеячамі нацыянальнага руху было вырашана склікаць экстранае пасяджэнне Рады рэспублікі на парадак дня паставіць толькі адно пытанне: аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай Народной Рэспублікі. Пасяджэнне Рады пачалося ўвечары 24 сакавіка 1918 г., на ім фракцыя БСГ унесла на абмеркаванне прапанову аб абвяшчэнні незалежнасці БНР. Гэтая прапанова выклікала вострыя спрэчкі, сапраўдную атаку з боку прадстаўнікоў земства, але ўсё ж была прынята. Даклад аб становішчы на Беларусі ў сучасны момант і аб прычынах, якія выклікалі абвяшчэнне незалежнасці зрабіў старшыня фракцыі БСГ А.Смоліч. Даклад зноў выклікаў хвалю спрэчак. Пасля напружанай дыскусіі, якая зацягнулася далёка за поўнач, большасцю галасоў была прынята наступная рэзалюцыя: "Рада БНР абвяшчае Рэспубліку незалежнай, аб чым выдае адпаведную Устаўную Грамату." (10).

Група Рады Рэспублікі, выдзеленая І Усебеларускім з'ездам, у якую ўваходзіла фракцыя БСГ, галасавала аднагалосна за незалежнасць. Гарадская група і прадстаўнікі Бунда былі супраць рэзалюцыі, але засталіся ў Радзе. Земская група ў складзе 9 чалавек выйшла з Рады (10).

25 сакавіка 1918 г. была выдадзена ІІІ Устаўная Грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, якая пастанавіла: "Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай" (11).

У сярэдзіне красавіка 1918 г. у Раду БНР замест пакінуўшых яе прыхільнікаў федэрацыі з Расіяй увайшлі прадстаўнікі мінскага аддзялення Беларускага Народнага Прадстаўніцтва. Нем-



Рэпазіторый БДПУ

цы лічылі Раду БНР сацыялістычнай, і ў процівагу ёй у Мінску было створана так званае Беларускае Народнае Прадстаўніцтва на чале з Р.Скірмунтам, П.Алексюком і інш. Да яго далучыліся некаторыя правыя з БСГ - А.Уласаў, А.Трусінскі, якія крытыкавалі Раду БНР за яе рэвалюцыйнае паходжанне (9). Непасрэдна пад іх уплывам Рада БНР прыняла вядомую тэлеграму кайзеру Вільгельму, якая была адпраўлена 25 красавіка 1918 г. У тэлеграме гаварылася: "Рада БНР, як выбраная прадстаўніца Беларускага народа звяртаецца да Вашай імператарскай вялікасці са словамі глыбачэйшай падзякі за асвабаджэнне Беларусі нямецкімі войскамі з цяжкага ўціску чужога пануючага здзеку і анархіі.

Рада БНР дэкляравала незалежнасць цэльнае і недзялімае Беларусі і просіць Вашу імператарскую Вялікасць аб абароне ў яе дамаганні дзеля ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і непадзельнасці ў звязі з Германскай імперыяй. Толькі пад абаронай Германскай імперыі бачыць край сваю добрую долю ў будучыне" (12).

Тэлеграму падпісалі старшыня Рады І.Серада, старшыня Народнага Сакратарыяту Я. Варонка, члены Рады Р.Скірмунт, А.Аўсянік, П.Алексін, П.Крэчэўскі, Я.Лёсік. За яе галасавалі 35 чалавек, устрымаліся 7, супраць - 4. У знак пратэсту са складу Рады выйшлі гарадская група, прадстаўнікі Бунда, Аб'яднанай Яўрэйскай Сацыялістычнай партыі (8.-С.113).

Уваход у Раду прадстаўнікоў Беларускага Народнага Прадстаўніцтва на чале з Р.Скірмунтам і адпраўка тэлеграмы кайзеру Вільгельму былі рашаючымі для лёсу Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Калі Грамада падтрымлівала імкненні і барацьбу працоўных мас за перамогу дэмакратыі ў межах Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі, то яна магла разлічваць на разуменне сваіх дзеянняў і атрамлівала сацыяльную апору ў народзе. Калі ж быў узят новы курс з разлікам на міласць германскага кайзера, БСГ увайшла ў хранічны крызіс, які прывёў яе спачатку да расколу, а потым да знікнення з гістарычнай арэны.

С.Рак-Міхайлоўскі пісаў наконт гэтага: "Што вы нарабілі? Я не магу паняць Сацыялістычнай Грамады. Як магла Грамада павергаць сябе ў трона Вільгельма і падаваць свае галасы ў Радзе за хаўрус Беларусі дэмакратычнай з імперыялістычнай Германіяй? Няўжо Бадунова, Грыб маглі гэта нарабіць? Я яшчэ цямлю ініцыятыву Грамады ў незалежнасці Беларусі. Гэта ініцыятыва - зеніт працы Грамады, а тэлеграма - труна Грамады..." (13).

Словы С.Рак-Міхайлоўскага здейсніліся, ужо ў маі 1918 г. першая палітычная нацыянальная партыя Беларусі – Беларуская сацыялістычная грамада перастала існаваць, на яе грунце утварыліся тры новыя палітычныя сілы.

**Заключэнне.** Такім чынам, на працягу студзеня – красавіка 1918 г. адбыліся змены у поглядах прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху, дзеячоў БСГ на праблему дзяржаўнасці Беларусі. Калі ў студзені – лютым існавала думка аб аўтаномнай сувязі Беларусі з Расійскай Федэратыўнай рэспублікайй, то пасля падпісання Брэсцкага міру, які не улічваў нацыянальных інтарэсаў беларускага этнасу і фактычна дзяліў тэрыторыю Беларусі на тры часткі, прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху, што знаходзіліся на акупіраванай германскімі войскамі тэррыторыі, перайшлі на пазіцыі супрацоўніцтва з імперыялістычнай Германіяй, разрыву адносін з Расіяй і тым самым страцілі падтрымку з боку рэвалюцыйнай дэмакратыі і беларускага народа.


1. Усебеларускі з'езд 1917 г.: сведчанне сучасніка//Беларускі гістарычны часопіс.-1993, №2.
2. Усебеларускі з'езд 1917 г.: сведчанне сучасніка//Беларускі гістарычны часопіс.-1993, №4.
3. НАРБ. Ф. 60, воп.3, спр.81, арк.46
4. НАРБ. Ф.60, воп.3, спр. 749, арк.306 – 307.
5. Собственноручные показания А.И. Луцкевича 30 октября 1939 г.//Неман.1995, №1.
6. НАРБ. Ф.60, воп.3, спр. 760, арк.20
7. Юхо Я. Беларускія ўрады 1918 – 1921 г.г. і іх паўнамоцтвы//Беларускі гістарычны часопіс.1993, №4.
8. Игнатенко И.И. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии.-Мн.1992.
9. Ігнаценка І. БНР – як гэта было//Звязда.1991.-23 сакавіка.-С.2.
10. НАРБ. Ф. 62, воп.1, спр.191, арк.5.
11. НАРБ. Ф. 60, воп.3, спр.755, арк.25.
12. НАРБ. Ф. 60, воп.3, спр.751, арк.45.
13. НАРБ. Ф. 62, воп.1, спр.193, арк.150.


Репозиторий ВГУ